ЭП/Кн251-а

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца штомесячна,
з II паўгоддзя 2011 года
Зарэгістраваны ў Міністэрстве
інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Пасведчанне ад 25.04.2011 № 1440

Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

ГІСТОРЫЯ і грамадазнаўства

№ 12 (53) 2015

**Заснавальнік і выдавец —
РУП «Выдавецтва
"Адукацыя і выхаванне"»
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь**

Вул. Будзённага, 21,
220070, г. Мінск;
тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу),
факс: 297-91-49
e-mail: history@aiv.by,
http://www.aiv.by

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

Мікалай Іосіфавіч МІНІЦКІ — галоўны рэдактар, доктар гістарычных навук, прафесар
П. Р. МАРТЫСЮК — першы намеснік галоўнага рэдактара, доктар філасофскіх навук, дацэнт
Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара, кандыдат гістарычных навук
Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар
Л. В. ЖЭРКА
В. М. ВАРАНОВІЧ
С. А. КУДРАЎЦАВА
Л. І. ШЧЭНІКАВА

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

В. У. ПАЗНЯКОЎ — старшыня рэдакцыйнай рады, доктар філасофскіх навук, прафесар
Я. М. БАБОСАЎ, доктар філасофскіх навук, прафесар, акадэмік
С. А. БАЛАШЭНКА, доктар юрыдычных навук, прафесар
В. В. БУШЧЫК, доктар палітычных навук, прафесар
П. А. ВАДАПЯНАЎ, доктар філасофскіх навук, прафесар
М. І. ВІШНЕЎСКІ, доктар філасофскіх навук, прафесар
В. В. ДАНІЛОВІЧ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
М. М. ЗАБАЎСКІ, доктар гістарычных навук, прафесар
А. А. КАВАЛЕНЯ, доктар гістарычных навук, прафесар
В. А. КАПРАНАВА, доктар педагагічных навук, прафесар
П. С. КАРАКА, доктар філасофскіх навук, прафесар
Г. У. КАРЗЕНКА, доктар гістарычных навук, прафесар
І. В. КАРПЕНКА
Г. А. КОСМАЧ, доктар гістарычных навук, прафесар
У. С. КОШАЛЕЎ, доктар гістарычных навук, прафесар
М. А. МАЖЭЙКА, доктар філасофскіх навук, прафесар
С. В. ПАНОЎ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт
С. В. РАШЭТНІКАЎ, доктар палітычных навук, прафесар
С. М. ХОДЗІН, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
І. І. ЦЫРКУН, доктар педагагічных навук, прафесар

Репозиторий БГПУ

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

ГІСТОРЫЯ і грамадазнаўства

КУЛЬТУРА ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

3 **Белокрылова В. А., Капитонова Т. А.** Историческая память свидетелей войны: образы врага и друга как экзистенциальный регулятив

ГІСТОРЫЯ ВЫХАВАННЯ

8 **Захарова Э. В.** Семейное воспитание в Республике Беларусь в первые годы советской власти

ЗМЕСТ І МЕТОДЫКА ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

13 **Врублеўскі Ю. У.** Узнікненне старажытных гарадоў на беларускіх землях у IX—XIII стагоддзях

АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

18 **Злачэўскі А. П.** Развіццё гуманітарных здольнасцей на ўроках гісторыі

19 **Злачэўскі А. П.** Знешняя небяспека ў першай палове XIII стагоддзя. Гісторыя Беларусі, VI клас

24 **Заровская И. Е.** Древнейшие люди каменного века. История Беларуси, VI класс

26 **Куделка И. Б.** Борьба Руси с внешними врагами. Всемирная история, VI класс

30 **Падкапаева С. Р.** Вытокі сярэдневяковай культуры. Сусветная гісторыя, VI клас

33 **Шишпаронок С. С.** Деньги. Обществоведение, X класс

ПАЗАКЛАСНАЯ РАБОТА

37 **Чарток Г. М.** Брэйн-рынг на тэму «Вялікае Княства Літоўскае»

39 **Демчук В. В., Жук С. А.** Примерные вопросы и задания для подготовки к олимпиаде по истории, VII класс

44 **Демчук В. В., Жук С. А.** Примерные вопросы и задания для подготовки к олимпиаде по истории, VIII класс

50 **Литвинова Л. В.** Золотое кольцо Гомельщины. Методическая разработка экскурсии

59 **Михно Н. Г.** В гости к лепельскому Цмоку. Внеклассное мероприятие, V—VII классы

МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ФАКУЛЬТАТЫВАЎ

62 **Гончаров Н. Н.** Православно-русская аксиологическая основа народно-монархического традиционализма начала XX века

На **першай старонцы вокладкі** — фота К. К. Шастоўскага «Касцёл святога Язэпа ў Валожыне».

Рэдактар *Л. В. Саламаха*, карэктар *Л. М. Сцяпанава*, камп'ютарны набор і вёрстка *А. Э. Задарожная*.

Выхад у свет 23.12.2015.
Фармат 60 × 84 1/8. Друк афсетны. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 7,9. Ул.-выд. арк. 8,4.
Тыраж 683 экз. Заказ № 086. Цана свабодная.

Адрас рэдакцыі часопіса «Гісторыя і грамадазнаўства»:
вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск; тэл. 297-93-20.

Надрукавана ў друкарні
РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
ЛП № 02330/327 ад 19.01.2012.
Вул. Захарава, 59, 220088, г. Мінск.

© РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2015
© Вокладка. К. К. Шастоўскі, В. К. Жалудкова, 2015

Репозиторий БГПУ

Узнікненне старажытных гарадоў на беларускіх землях у IX—XIII стагоддзях

Ю. У. Врублеўскі, кандыдат гістарычных навук,
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства гімназіі № 40 г. Мінска

Гістарычная адукацыя, якая рэалізуецца сёння ва ўстановах сярэдняй школы, накіравана на фарміраванне сацыяльна актыўнай і творчай асобы, грамадзяніна і патрыёта Айчыны [1, с. 4]. У гэтай сувязі ўзрастае патрэба ў асэнсаванні месца айчыннай гісторыі ў сусветным працэсе і вызначэнні дасягненняў сусветнай і айчыннай гісторыі. Тым самым урок гісторыі становіцца важнай пляцоўкай, якая закладвае істотныя ўяўленні аб асаблівасцях гісторыка-культурнага развіцця беларускай нацыі і перадумовах складвання беларускай дзяржаўнасці. Важным напрамкам сучаснай гістарычнай адукацыі з'яўляецца праблема гарадскога развіцця, з якой звязваецца зараджэнне феадальнага ўкладу грамадства і фарміравання інстытутаў дзяржаўнай улады. Складаным з пункту гледжання тэарэтычнага зместу і метадычнага складніка з'яўляецца інтэрпрэтацыя пытанняў узнікнення старажытных гарадоў у межах школьнай праграмы. **Мэта** гэтага артыкула — прапанаваць адукацыйную мадэль вывучэння тэмы «Узнікненне старажытных гарадоў» на падставе навуковых матэрыялаў, якія ўводзяцца ў навучальны зварот [2].

У адпаведнасці са зместам школьнай праграмы па гісторыі школьнікі ўпершыню пачынаюць знаёміцца з гісторыяй старажытных усходнеславянскіх гарадоў у VI класе. Так, напрыклад, у школьным падручніку «История Беларуси: с древнейших времён до середины XIII в.» вывучаецца тэма «Город в IX — середине XIII в.» [3]. Настаўнік дапамагае вучню правільна вызначыць прычыны адасаблення рамяства ад сельскай гаспадаркі, назваць асноўныя шляхі ўзнікнення гарадоў, растлумачыць, у якіх найбольш зручных месцах з'яўляліся гарадскія пасяленні і як выглядалі старажытныя гарады. Такім чынам, школьнікі атрымліваюць інфармацыю аб першых гарадах на беларускіх землях. Для задавальнення інфармацыйных патрэб шасцікласнікаў неабходна адказаць на наступныя пытанні. Як узнікаў усходнеславянскі горад? Ці былі ў горада папярэднікі? Што ўяўляў сабою старажытны горад? Чым ён адрозніваўся ад іншых населеных пунктаў? З якіх структурных частак складаўся?

Адказы на гэтыя пытанні дапамогуць актывізаваць пазнавальную цікавасць вучняў і павысіць эфектыўнасць урока гісторыі. З школьнага падручніка нам вядома, што ў аснове ўзнікнення горада былі розныя шляхі: замак, манастыр, племянны цэнтр, гандлёвае пасяленне. Але як патлумачыць, што ўчарашні замак ці манастыр, як папярэднік, стаў горадам у пэўным сэнсе гэтага слова? На наш погляд, неабходна правільна вызначыць дэфініцыю старажытнага горада. Вядомы расійскі гісторык В. В. Карлаў зазначаў, што «... городами раннефеодальной эпохи можно считать укреплённое поселение, выполнявшее в системе феодальных отношений целый комплекс функций — экономических, политических, административно-хозяйственных, культурных» [4, с. 38]. З гэтым вызначэннем можна пагадзіцца. Разам з тым неабходна ўдакладніць, што горад заўсёды ўзнікаў як *цэнтр рамяства і гандлю*. Як справядліва падкрэсліваў расійскі археолаг Л. В. Аляксееў, «... для его конкретного

Репозиторий БГПУ

возникновения ... необходимы два обстоятельства: торгово-транзитный путь ... и наличие укреплённого пункта, гарантирующего его безопасность. Последним мог быть и замок феодала, и монастырь, и даже племенной центр» [5, с. 132]. Такім чынам, канцэнтрацыя значнай часткі рамеснікаў і купцоў каля абарончых фартыфікацый населенага пункта садзейнічала пераўтварэнню яго ў горад. Паступова гэты населены пункт набываў новыя функцыі. Акрамя *абарончых* і *гандлёва-рамесных* функцый, горад стаў *цэнтрам акругі* (селішчаў, якія акружалі горад), з якой цягнулася даніна (адміністрацыйная функцыя). Затым у гарадах пачалі будавацца культавыя будынкі, зараджалася пісьменнасць (пра гэта сведчаць знойдзеныя пісалы, берасцяныя граматы), а затым і навука. Горад пачаў выконваць *культурную* функцыю.

Як ужо адзначалася вышэй, у горада мог быць і свой папярэднік. Гісторыкам і археолагам вядома, што ў яго якасці маглі выступіць замак, племянны цэнтр, манастыр, гандлёва-рамеснае пасяленне або ваенная крэпасць і прагорад. Археолагі высветлілі, што шэраг беларускіх гарадоў меў сваіх папярэднікаў. Да іх ліку навукоўцы адносяць Полацк, Віцебск, Лукомль, Менск, Гомель, Крычаў, Пінск, Мазыр, Друцк [6, с. 5]. Самы старажытны горад Беларусі, Полацк, пачынаў сваю гісторыю з невялікага гарадзішча, якое знаходзілася на левым беразе р. Палаты, а затым цэнтр горада перамясціўся ў вусце Дзвіны *(мал. 1)*.

Малюнак 1 — **Полацкае гарадзішча — першапачатковы цэнтр Полацка**

Падобныя працэсы назіраліся і ў Мінску, калі першапачатковы цэнтр горада, яго папярэднік, знаходзіўся ў 16 км на паўднёвым захадзе ад сучаснага Мінска ў в. Строчыца, дзе працякала амаль высахлая зараз р. Менка. Тут існаваў буйны археалагічны комплекс, жыццё на якім перапынілася ў другой палове XI ст. Функцыі Менкаўскага пасялення перайшлі да Мінскага замчышча на Нямізе *(мал. 2)*.

Малюнак 2 — **Менкаўскае пасяленне — першапачатковы цэнтр Мінска**

Важным з'яўляецца і разгляд такога пытання, як сутнасць горада, інакш кажучы, што ён сабою ўяўляў і чым адрозніваўся ад іншых пасяленняў. Горад — гэта такі арганізм, які паступова ўскладняецца ў сваім развіцці. З цягам часу ён узрастаў на месцы замка ці крэпасці. Зараджэнне і развіццё горада вызначаюцца з'яўленнем такіх яго тэрытарыяльных адзінак, як *дзядзінец, вакольны горад* і *пасад*. ***Дзядзінец*** — гэта найбольш умацаваная частка паселішча (уключае розныя фартыфікацыйныя паясы абароны: валы, равы, навальныя і ўнутрывальныя канструкцыі) *(мал. 3)*. ***Пасад*** — неўмацаваная частка гарадскога паселішча, на якой пражываюць купцы і рамеснікі. ***Вакольны горад*** — частка горада, якая размяшчалася вакол дзядзінца і перавышала яго памеры (часцей узнікала на месцы ранейшага пасада). Важнай прыкметай горада з'яўлялася наяўнасць трохчастковай тапаграфічнай структуры па сістэме: дзядзінец—вакольны горад—пасад *(мал. 4)*.

Рэпозиторий БГПУ



Малюнак 3 — **Выгляд дзядзінца**



Малюнак 4 — **Дзядзінец (знізу), вакольны горад (зверху), пасад Турава**

Такая структура сведчыла аб істотным развіцці гарадскога пасялення.

Каб адрозніваць горад ад іншага пасялення, магчыма абапірацца на гісторыка-археалагічныя крытэрыі, прапанаваныя айчыннымі навукоўцамі: сведчанні існавання мясцовага рамяства і развітога гандлю, наяўнасць дзядзінца і пасада; пражыванне значнай часткі гандлёва-рамеснага насельніцтва; наяўнасць манументальна-культавых збудаванняў (цэркваў); устойлівая тэндэнцыя росту плошчы дзядзінца і пасада; размяшчэнне пасада па абодвух берагах ракі; спецыфічны культурны слой (наяўнасць бытавых знаходак); магутнасць абарончых збудаванняў.

З дапамогай прыведзеных крытэрыяў магчыма замацаваць веды вучняў аб сутнасці старажытнага горада. Для пашырэння ўяўленняў школьнікаў пра прыроду ўсходнеславянскага горада можна выкарыстоўваць схематычныя планы яго тэрытарыяльнай структуры, дзе паказваецца кожная частка. Галоўным адміністрацыйным цэнтрам горада быў дзядзінец, дзе размяшчалася рэзідэнцыя князя і жылі дружыннікі. Тут маглі пражываць і рамеснікі, якія абслугоўвалі княжацкі двор. Звычайна дзядзінец займаў прыроднае ўзвышша, якое потым агароджвалі валамі і равамі. Непадалёку ад дзядзінцаў размяшчаліся *пасады* і *вакольны горад*, на іх і пражывала гандлёва-рамеснае насельніцтва. Часцей за ўсё пасады ўзнікалі па берагах ракі, якая выкарыстоўвалася рамеснікамі ў вытворчых мэтах і гандлярамі як транспартны сродак камунікацый. Па меры павелічэння гарадскога насельніцтва пасады распаўсюджваліся і на астатнюю тэрыторыю горада. Калі ўзнікала неабходнасць узвядзення дадатковых абарончых збудаванняў, жыхары будавалі вакольны горад. Для яго будаўніцтва яны маглі выкарыстоўваць частку пасадскай тэрыторыі, што знаходзілася побач з дзядзінцам. Гэта павышала абароназдольнасць горада і яго жыхароў. Як правіла, непадалёку ад горада знаходзіліся і *курганныя могільнікі* (некропалі).

У старажытнарускіх летапісах і іншых крыніцах IX—XIII стст. на тэрыторыі Беларусі называюцца 34 гарады, што дакладна ідэнтыфікаваны, вывучаны і археалагічна даследаваны: з IX ст. — Полацк; з X ст. — Заслаўе, Тураў, Віцебск; з XI ст. — Браслаў, Брэст, Друцк, Копысь, Лагойск, Лукомль, Мінск, Орша, Пінск; з XII ст. — Барысаў, Брагін, Гомель, Гродна, Клецк, Мазыр, Мсціслаў, Навагрудак, Рагачоў, Слуцк, Слаўгарад (Прапойск), Чачэрск; з XIII ст. — Ваўкавыск, Здзітаў, Камянец, Капыль, Кобрын, Рэчыца, Слонім, Турыйск. Некаторыя гарады ўзнікалі раней, чым трапілі на старонкі летапісаў (Полацк, Навагрудак, Гродна, Ваўкавыск, Капыль і інш.). Застаецца невядомым месцазнаходжанне такіх летапісных гарадоў, як Галацічаск, Гарадзец, Некалач, Стрэжаў [7, с. 256—257].

Важнай прыкметай горада з'яўляецца тэндэнцыя да пашырэння пасадскай тэрыторыі. Для яе вызначэння звярталі ўвагу на наяўнасць у культурных напла-

Репозиторий БГПУ

ставаннях спецыфічных археалагічных матэрыялаў ці прадметаў рэчавага побыту. Наяўнасць пасада вызначалася таксама прысутнасцю на ім гандлёвых таргоў ці гандлёвых радоў. У шэрагу выпадкаў на пасадах размяшчаліся культавыя будынкі, гандлёвыя майстэрні.

Такім чынам, старажытны ўсходнеславянскі горад — гэта ўмацаваны населены пункт, які ўзнікаў як цэнтр рамяства і гандлю і выконваў шэраг функцый, а затым ускладняўся ў далейшым развіцці. Росту гарадоў спрыяла іх геаграфічнае размяшчэнне — скрыжаванні гандлёвых шляхоў, блізкасць ракі ці возера, якія выкарыстоўваліся як транспартныя магістралі. Важнай гарадской прыкметай выступае наяўнасць трох частак тэрытарыяльнай структуры (дзядзінца, пасада і вакольнага горада). Але найбольш распаўсюджанай з'яўлялася структура з дзвюх частак: дзядзінец — пасад. Гэта сістэма ўсходнеславянскіх гарадоў прыкладна адпавядала структуры Burg — Stadt у нямецкіх гарадах ці citi — town — англійскіх.

Схематычныя планы тэрытарыяльнай структуры гарадоў *(мал. 5, 6)*

Малюнак 5 — **Дзядзінец і вакольны горад Навагрудка**

Малюнак 6 — **Дзядзінец, вакольны горад, пасад Турава**

Падсумоўваючы сказанае, неабходна зазначыць, што вывучэнне пытанняў узнікнення і далейшага развіцця старажытных гарадоў на беларускіх землях дае ўяўленні аб зараджэнні інстытутаў дзяржаўнай улады і пераходзе да феадальнага грамадскага ладу жыцця. Выкарыстанне гэтых матэрыялаў у школьнай праграме дазволіць атрымаць поўную карціну працэсу горадаўтварэння як працэсу гістарычнага развіцця. Асэнсаванне праблемы ўзнікнення гарадоў будзе садзейнічаць актывізацыі ўвагі да гістарычнага мінулага і павышэнню гонару за гісторыю старажытнасцей на беларускіх землях.

Практычныя рознаўзроўневыя заданні

I узровень

Варыянт 1. Устаўце прапушчаны элемент сказа. Гарады ўзнікалі ў спрыяльных геаграфічных месцах: каля скрыжавання …, ……, і выконвалі абарончыя, ……, …… функцыі.

Варыянт 2. Устаўце прапушчаны элемент сказа. Планіроўка горада складалася з некалькіх частак: ……, …… і пасада, на якім пражывалі … і … .

Рэпазіторый БГПУ

II узровень

Варыянт 1. Раскрыйце значэнне гістарычных паняццяў: *горад, дзядзінец, цэнтр рамяства і гандлю.*

Варыянт 2. Раскрыйце значэнне гістарычных паняццяў: *пасад, вакольны горад, папярэднік горада.*

III узровень

Варыянт 1. Вызначце паслядоўнасць гістарычнага працэсу (узвядзенне замка, засяленне рамеснікаў і гандляроў, будаўніцтва пасада). Свой адказ растлумачце.

Варыянт 2. Апішыце з дапамогай выявы гістарычную з'яву. Уплыў геаграфічнага становішча на абарончыя функцыі горада.

IV узровень

Варыянт 1. Якія ўмовы садзейнічалі спрыяльнаму развіццю горада? Свой адказ растлумачце.

Варыянт 2. Чаму канцэнтрацыя значнай часткі гандлёва-рамеснага насельніцтва з'яўляецца важнай рысай горада?

V узровень

Варыянт 1. Ахарактарызуйце працэс узнікнення і развіцця горада на асобным прыкладзе (пэўны горад ці некалькі гарадоў).

Варыянт 2. Чым адрозніваўся папярэднік горада ад непасрэднага горада? Што аб'ядноўвае гэтыя паняцці?

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Учебные программы для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения. Всемирная история. История Беларуси. V—XI классы.

2. *Врублеўскі, Ю. У.* Гістарыяграфія гісторыі ўзнікнення і развіцця гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў IX—XIII стст. : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.09 / Ю. У. Врублеўскі. — Мінск, 2013. — 148 с.

3. *Штыхов, Г. В.* История Беларуси: с древнейших времён до середины XIII в. : учебник / Г. В. Штыхов, С. Н. Темушев, В. В. Ракуть; под ред. : Г. В. Штыхова, Ю. Н. Бохана. — Минск : ИЦ БГУ, 2009. — 143 с.

4. *Карлов, В. В.* О факторах экономического и политического развития русского города в эпоху средневековья (к постановке вопроса) / В. В. Карлов // Русский город (историко-методологический сборник) / Моск. гос. ун-т ; под ред. В. Л. Янина. — М., 1976. — С. 32—69.

5. *Алексеев, Л. В.* Полоцкая земля. Очерки истории Северной Белоруссии в IX—XIII вв. / Л. В. Алексеев. — М. : Наука, 1966. — 295 с.

6. *Штыхов, Г. В.* Средневековые города Беларуси и их предшественники (к проблеме восточнославянского протогорода) / Г. В. Штыхов // Вестник Полоцкого гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. — 2008. — № 1. — С. 2—6.

7. *Штыхаў, Г. В.* Горад / Г. В. Штыхаў // Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. — Мінск, 2009. — Т. 1. — С. 256—257.

У наступным нумары часопіса будуць змешчаны матэрыялы вебінара «Тэхналогія канструявання шматмерных дыдактычных інструментаў у навучанні гісторыі», які адбыўся ў БДПУ 14 кастрычніка 2015 г.

Рэпазіторый БГПУ